■ Камунальныя стасункі

# «Жыроўкі» будуць зразумелымі

## А тарыфы — празрыстымі

**Менавіта так гучыць галоўная ідэя Указа кіраўніка дзяржавы №107. Сёлета вызначаныя ў ім гранічныя тарыфы будуць дзейнічаць у любым пункце краіны. «Прынятым дакументам зроблены вялікі крок да празрыстасці тарыфаў. А надалей спецыялістам арганізацый пастаўлена задача выкарыстоўваць цалкам зразумелы механізм фарміравання затрат», — падкрэсліў міністр жыллёва-камунальнай гаспадаркі Аляксандр ЦЕРАХАЎ. Кіраўнік галіны адзначыў, што цяпер урад вызначыў дакладны алгарытм фарміравання гэтых выдаткаў і так званую планава-разліковую цану, каб выключыць факты безгаспадарчасці і разгільдзяйства, а таксама няпрофільныя выдаткі.**



Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

### ПЛАТА ЗА ДАМАФОНЫ І ЛЬГОТЫ ДЛЯ ДЗЯЦЕЙ

Указ № 107 вызначае гранічныя ўзроўні тарыфаў на 14 відаў жыллёва-камунальных паслуг. Вядома, што істотна былі зніжаныя тарыфы на ваду (аб чым мы паведамлялі ўчора). Гэтым дакументам упершыню зацверджаны і адзіны гранічны тарыф на тэхнічнае абслугоўванне дамафонаў — 9100 рублёў з кватэры для ўсіх арганізацый незалежна ад формы ўласнасці. «Але гэтая плата бярэцца пры ўмове, калі людзьмі былі заключаны дагаворы з арганізацыяй па абслугоўванні, бо гэтая паслуга з'яўляецца дадатковай», — растлумачыў Аляксандр Церахаў.

Важнай навацыяй дакумента з'яўляецца льгота для дзяцей ва ўзросце да 7 гадоў, якія вызваляюцца ад платы за тэхнічнае абслугоўванне ліфтаў і за іх электразабеспячэнне, а таксама за прыборку месцаў агульнага карыстання.

### ТАРЫФЫ «ПРЫВЯЖУЦЬ» ДА ЧАЛАВЕКА

— Цяпер налічэнне платы за электраэнергію па спецыяльных тарыфах пенсіянерам і інвалідам магчыма па месцы іх знаходжання, выбар за чалавекам, — адзначыў Аляксандр Церахаў.

Ён растлумачыў, што асабліва гэта актуальна для тых, хто ў летні перыяд з'язджае за горад. «Тарыф будзе прывязаны альбо да кватэры, дзе чалавек зарэгістраваны, альбо, па яго жаданні, да індывідуальнага дома ў вёсцы альбо ў іншым населеным пункце», — сказаў міністр.

### «ЗАЛАТАЯ» ВАДА ДЛЯ ПУСТОЙ КВАТЭРЫ БЕЗ ЛІЧЫЛЬНІКА

У новым дакуменце прадугледжана вызначэнне аплаты за паслугі водазабеспячэння ў пустых дамах (кватэрах), дзе не ўстаноўлены індывідуальныя прыборы ўліку вады. Налічэнне за паслугу водазабеспячэння ў гэтым выпадку будзе вызначацца зыходзячы з разліковай колькасці грамадзян. Умоўна кажучы, будзе лічыцца, што на кожных 20 квадратных метрах пустой кватэры жыве адзін чалавек.

Напрыклад, для пустой сталічнай трохпакаёвай кватэры плошчай больш за 60 квадратных метраў будзе брацца плата з трох жыхароў па 260 літраў вады ў суткі на чалавека па максімальным кошце. «Норма даволі жорсткая, але неабходная, каб прымусіць паставіць лічыльнікі паўсюдна. Больш за тое, яна ўступіць у сілу з 1 кастрычніка 2016 года», — растлумачыў сітуацыю Аляксандр Церахаў.

Не сакрэт, што ў пустых на паперы кватэрах людзі пражываюць або здаюць іх у арэнду нелегальна, пры гэтым, не маючы прыбора ўліку вады, карыстаюцца паслугамі водазабеспячэння. Цяпер у краіне 98% жылога фонду абсталявана індывідуальнымі прыборамі ўліку вады, але ў галіне лічаць неабходным прастымуляваць і астатніх грамадзян да ўстаноўкі лічыльнікаў. Цяпер у іх будзе яшчэ паўгода, каб гэта зрабіць.

Калі гэтага не зрабіць, то і надалей могуць узнікаць розныя нестыкоўкі. Так, летась толькі сталіца не атрымала плату за 9 млн кубаметраў вады, якая была пастаўлена жыллёваму сектару, але ў лічыльніках зафіксавана не была.

Аналагічная норма ў 20 кв.м будзе тычыцца платы ў пустых дамах за тэхабслугоўванне ліфта, санітарнае ўтрыманне дапаможных памяшканняў жылога дома, за электраэнергію пад'ездаў і працу абсталявання. Ацяпленне ў пустых кватэрах будзе аплачвацца па тарыфах, якія цалкам пакрываюць затраты на такую паслугу.

### КРОПКА Ў СПРАВЕ ЛІФТА

Дакумент удакладняе, што не трэба плаціць за ліфт і электраэнергію на яго рух тым жыхарам дамоў, якія па стане здароўя не могуць ім карыстацца або маюць кватэры на першых паверхах. Прапісана цяпер і норма, якая дазваляе заблакіраваць кнопку ліфта на другім паверсе і не плаціць за яго. «Заблакіраваць кнопку ліфта другога паверху можна, калі ўсе згодныя менавіта на вашай пляцоўцы. Тады кнопка блакіруецца, і гэтыя грамадзяне вызваляюцца ад аплаты за карыстанне ліфтам», — растлумачыў міністр.

Пры гэтым Аляксандр Церахаў падкрэсліў, што плата за тэхабслугоўванне ліфта і прыбору пад'ездаў цяпер будзе падлічвацца ў разліку на чалавека, а не ў залежнасці ад плошчы кватэры. «Для людзей усё ж такі бліжэй прывязка не да квадратных метраў, а да чалавека. У ліфце ездзіць чалавек, ён карыстаецца месцам агульнага карыстання, таму мы пачулі заўвагі людзей», — удакладніў спадар Церахаў.

### У ЭЛЕКТРОНЦЫ — ХОЦЬ СЁННЯ

Аплацiць жыллёва-камунальныя паслугі за люты мінчане змогуць з 26 сакавіка, паведаміў першы намеснік старшыні Мінгарвыканкама Уладзімір Кухараў.

Цяпер практычна завершана налічэнне і перараздлік платы за аказаныя паслугі. Яшчэ ў пятніцу планавалася выставіць плацежныя дакументы ў электроннай сістэме komplat.by. А аплаціць ЖКП на пошце і ў банку мінчане змогуць з 26 сакавіка.

Дастаўка насельніцтву паведамленняў аб аплаце за жыллёва-камунальныя паслугі ў Мінску будзе ажыццяўляцца 26, 27 і 28 сакавіка. Папяровы варыянт жыровак усе мінчане змогуць пабачыць абавязкова да 29 сакавіка.

У сваю чаргу Аляксандр Церахаў нагадаў, што аплаціць лютаўскія жыроўкі беларусы змогуць да 5 красавіка без збірання пені і штрафу.

### ЗА КОШТ УНУТРАНЫХ РЭЗЕРВАЎ

Тарыфы на год вызначаны. У Міністэрстве эканомікі цяпер дакладна падлічылі, колькі сёння пакрываецца па кошце ЖКП на прыкладзе стандартнай двухпакаёвай кватэры. Узровень кампенсацыі насельніцтвам па камунальцы цяпер складае крыху больш за 40%. Пры гэтым да канца года перад галіной пастаўлена задача выйсці на ўзровень не менш за 50%. Аднак цяпер гэта трэба зрабіць не за кошт павышэння тарыфаў, а за кошт зніжэння ўнутраных выдаткаў і непрадукцыйных страт.

Аляксандр Церахаў растлумачыў, што ў міністэрстве прааналізавалі рэзервы галіны і ацанілі іх у памеры 2,5 трлн рублёў. «Гэта сур'ёзная задача, якая стаіць перад усімі арганізацыямі ЖКГ, але ўжо распрацаваны дакладныя планы мерапрыемстваў, дзе прапісана ўсё, што трэба зрабіць», — адзначыў ён.

### ДВУХБАКОВЫЯ ЖЫРОЎКІ АТРЫМАЕМ УЖО Ў МАІ

Кіраўніцтва ЖКГ ужо сёння прынцыпова вызначылася, як будзе выглядаць рахунак-паведамленне. Самае галоўнае, што, з аднаго боку, яно павінна быць максімальна інфарматыўным, з другога — простым для ўспрымання.

Паводле слоў міністра, плануецца, што жыроўка будзе двухбаковай. «Для тых, каму дастаткова пагледзець на кошт паслуг і на тое, як яны разлічаны, будзе інфармацыя на адной старонцы. Для тых, хто хоча больш дэталёва і ўедліва пагледзець, з чаго склаліся затраты, якi ўзровень кампенсацыі, — калі ласка, на адваротным баку будзе прыведзена гэтая інфармацыя. Спажывец зможа пралічыць, пераправерыць і быць проста праінфармаваным па тых момантах, якія там будуць пазначаны», — растлумачыў міністр.

**Сяргей КУРКАЧ.**
*kurkach@zviazda.by*

■ Скандал, якога не было

# ДЫ ХОЦЬ ТЫ ДВОЙЧЫ «КАРОЛЬ»...

## Мытнікі не даюць паблажак нікому, хто перасякае дзяржаўную мяжу

**«Беларуская мытня сарвала канцэрт Кіркорава» — падобнымі загалоўкамі стракацелі інфармацыйныя стужкі інтэрнэта і газетных старонкі. Кароль расійскай поп-сцэны не паспеў у Вільнюс «з-за беларускіх мытнікаў». Пра гэта ён сам напісаў у сацыяльных сетках, абураючыся, што на мяжы Беларусі і Літвы доўга не пропускалі фуры з абсталяваннем і аўтобусы з персаналам. Маўляў, іх трымалі на даглядзе ледзь не цэлы дзень.**

Але, мяркуючы па ўсім, «зорка» крыху перабольшыла... Прынамсі, у Дзяржаўным мытным камітэце нам прывялі канкрэтныя факты, падмацаваўшы іх лічбамі і бясспрэчнымі аргументамі.

— 23 сакавіка 2016 года ў пункт пропуску «Каменны Лог» прыбылі чатыры грузавыя транспартныя сродкі, у якіх перамяшчалася абсталяванне для гастрольнага тура Філіпа Кіркорава, — расказвае **начальнік упраўлення арганізацыі мытнага кантролю Дзяржаўнага мытнага камітэта Беларусі Сяргей ФЁДАРАЎ**. — Таксама ў пункт пропуску прыбылі два аўтобусы з суправаджальным персаналам. У 11.50 у мытныя органы кіроўцамі грузавых транспартных сродкаў былі прадастаўлены дакументы. У 12.30 афармленне дакументаў завяршылася — гэта значыць, што на афармленне кожнага транспартнага сродку было затрачана не больш чым 10 хвілін. Што тычыцца кіроўцаў аўтобусаў, то імі загадзя не былі падрыхтаваны фармуляры — так названыя спісы пасажыраў, абавязковая наяўнасць якіх прадугледжана спецыяльным пагадненнем паміж Расійскай Федэрацыяй і Літвой, а таксама заканадаўствам Рэспублікі Беларусь аб міжнародных перавозках пасажыраў. Кіроўцам было аказана садзейнічанне ў запаўненні дакументаў. Пасля таго як у 14.10 супрацоўнікам мытні былі прадстаўлены фармуляры, на працягу 18 хвілін два пасажырскія аўтобусы былі аформлены. Такім чынам, супрацоўнікі мытні затрацілі менш чым 9 хвілін на афармленне кожнага транспартнага сродку.

Выходзіць, змены ў гастрольным графіку артыста адбыліся не з-за беларускіх мытнікаў. Яны вельмі прафесійна і аператыўна выканалі сваю справу. А калі хтосьці разлічваў на праезд без мытнага дагляду, то ў той сітуацыі, калі ўвесь свет у сувязі з тэрарыстычнай небяспекай перавозак ў напружанае становішча, гэта было немагчыма. І няважна, каму гэтыя транспартныя сродкі належаць.

**Вераніка КАНЮТА.** *kanyuta@zviazda.by*


белагропромбанк

С 01 апреля 2016 года на основании постановления Правления Национального банка Республики Беларусь от 15.03.2016 № 131 размер ставки рефинансирования установлен в размере 24,0 процента годовых.

В соответствии с условиями договоров ОАО «Белагропромбанк» сообщает об уменьшении процентных ставок по договорам банковского вклада «Универсальный», заключенным в период с 02.08.2004 по 05.03.2006, и «Сберегательный», заключенным в период с 25.10.2004 по 05.03.2006, на 1 процентный пункт с 27.04.2016.

www.belapb.by
ПОЗВОНИ В СВОЙ БАНК 136

Лицензия на осуществление банковской деятельности № 2 от 26 мая 2014 года, выдана Национальным банком Республики Беларусь. УНП 100693551.

белагропромбанк

ОАО «Белагропромбанк» информирует, что в соответствии с решением Комитета по управлению активами и пассивами ОАО «Белагропромбанк» от 18.03.2016, протокол № 24, с 01.04.2016 размер процентной ставки по вновь заключаемым договорам банковского вклада (депозита) физических лиц до востребования составит:

в белорусских рублях – 2% годовых;

в иностранной валюте – 0,1% годовых.

Данный размер процентных ставок применяется с 01.04.2016:

для ранее заключенных договоров банковского вклада (депозита) физических лиц до востребования в белорусских рублях;

для вновь заключаемых договоров банковского вклада (депозита) до востребования «Пенсионный»;

для договоров банковского вклада (депозита) до востребования «Пенсионный», заключенных в период с 25.11.2015 по 31.03.2016.

www.belapb.by
ПОЗВОНИ В СВОЙ БАНК 136

Лицензия на осуществление банковской деятельности № 2 от 26 мая 2014 года, выдана Национальным банком Республики Беларусь. УНП 100693551.


■ Здарэнні

# МАК НА МІЛЬЯРДЫ

**Супрацоўнікі сталічнага наркакантролю пры падтрымцы байцоў спецпадраздзялення «Алмаз» у адным з гаражных кааператываў выявілі і канфіскавалі каля двух тон насення маку.**

Гараж належаў 58-гадовай пенсіянерцы, якая здавала яго ў наём. Падчас вобыску наркакантралёры знайшлі там 9 папяровых мяхоў, 44 палімерныя і яшчэ 18 скрынь з насеннем маку. Агулам кошт канфіскаванага складае каля двух мільярдаў рублёў. Да слова, на «чорным рынку» адзін кілаграм маку каштуе мільён рублёў, а пры набыцці ўнача — ужо 1,3 мільёна рублёў. Цяпер вядуцца пошукі ўладальніка наркасыравіны.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**
*rs@zviazda.by*


Руденский сельский исполнительный комитет Пуховичского района Минской области
ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН ПО ПРОДАЖЕ ЗЕМЕЛЬНОГО УЧАСТКА
в частную собственность для строительства и обслуживания жилого дома гражданам Республики Беларусь, расположенного в Руденском сельсовете

| № лота | Адрес земельного участка | Площадь (га) | Наличие инженерных сетей | Начальная цена (рублей) | Затраты | Задаток (рублей) |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | д. Анетово, ул. Лесная, д. 26. Кадастровый номер 624485700101000419 | 0,1499 | Сети электроснабжения, водоснабжения, газовый кооператив | 64 852 900 | 15 506 800 | 6 485 300 |

Аукцион состоится **29 апреля 2016 года в 10.00** по адресу: г.п. Руденск, ул. Ленинская, д. 17 Пуховичского района Минской области. Заявления на участие и необходимые документы принимаются **до 25 апреля 2016 года до 17.00** по вышеуказанному адресу. Контактные телефоны: **(801713) 6 32 80, 6 32 75, 6 31 80.** Расходы по организации и проведению аукциона, затраты на публикацию информационного сообщения подлежат возмещению победителем аукциона.

УНН 600177785